УДК 882.6.09. – 1

*А.М. ШЫЛЕЦ*

# ТЫПЫ МАСТАЦКАГА МІФАЛАГІЗМУ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ

*Паэтычнае мысленне мае шмат агульнага з міфалагічным. Адной з асаблівасцей беларускай паэзіі канца XX – пачатку XXI ст. з'яўляецца мастацкі міфалагізм. Дадзены артыкул разглядае мастацкі міфалагізм як асаблівую паэтыку, заснаваную на светапогляднай і сюжэтна-вобразнай сістэме міфа. Праз аналіз спосабаў міфалагізацыі ў мастацкіх творах даследуюцца розныя тыпы паэтычнага светабачання ў творчасці сучасных паэтаў. У артыкуле даследуюцца такія спосабы мастацкай міфалагізацыі, як узнаўленне глыбінных структур мыслення; увядзенне ў аповед асобных міфалагічных матываў; зварот да пластоў нацыянальнага быцця і свядомасці, якія яшчэ захоўваюць сувязь з міфалогіяй; арыентацыя на першапачатковыя канстанты чалавечага і прыроднага быцця і інш. На падставе аналіза сцвярджаецца, што ў сучаснай беларускай паэзіі прысутнічаюць арганічны, знешні і сінтэтычны тыпы міфалагізму.*

Неаміфалагічная свядомасць – гэта прыкмета культурнай ментальнасці ўсяго XX ст. Міфалагічныя сюжэты, матывы, структуры актыўна выкарыстоўваюцца ў мастацкіх творах. Міф успрымаецца не толькі як форма старажытнага мыслення, але і як неад'емная ўласцівасць чалавечай свядомасці. Паэтычнае мысленне мае шмат агульнага з міфалагічным. Міфалагізм мастацкага твора, калі разглядаць яго як структурны элемент эстэтычнай сістэмы, знаходзіцца на мяжы зместу і формы, вобразнай канцэпцыі свету, створанага паэтам, і паэўнага стылю, які рэалізуе гэту канцэпцыю. Традыцыйна пад мастацкім міфалагізмам разумеюць актуалізацыю ў творы элементаў міфалагічнай свядомасці, зварот пісьменнікаў да старажытнай міфалагічнай спадчыны, а таксама да новых міфалагем. Сувязі літаратуры і міфа можна прасачыць на розных узроўнях. У сучасным літаратуразнаўстве існуе некалькі класіфікацый выкарыстання літаратурай міфалагічнай спадчыны (В. Тапароў, Е. Меляцінскі, М. Эпштэйн, Д. Нізаміддзінаў, В. Каваленка, У. Калеснік, Т. Шамякіна і інш.). Спынімся на абагульненай класіфікацыі В. Тапарова і падрабязнай класіфікацыі М. Эпштэйна. В. Тапароў выдзяляе тры тыпы міфалагізму ў мастацкім творы: арганічны (уласцівы паэтычнаму светаадчуванню мастака), знешні (заснаваны на засваенні міфалогіі як культурнага пласта) і сінтэтычны (спалучае першыя два тыпы). М. Эпштэйн разглядае наступныя тыпы міфалагізму: 1) стварэнне аўтарскай сістэмы міфалагем; 2) узнаўленне глыбінных структур мыслення; 3) рэканструкцыя міфалагічных сюжэтаў; 4) увядзенне ў аповед асобных міфалагічных матываў і персанажаў; 5) узнаўленне пластоў нацыянальнага быцця і свядомасці; 6) прытчавасць, лірыка-філасофская медытацыя, арыентаваная на першапачатковыя канстанты чалавечага і прыроднага быцця. Варта звярнуць увагу на тое, што ў беларускай паэзіі назіраецца прысутнасць усіх вышэйзгаданых тыпаў міфалагізму, пры гэтым існуе тэндэнцыя да іх сінтэзу.

На наш погляд, для беларускай паэзіі канца XX – пачатку XXI ст. характэрны міфалагізм як асаблівая паэтыка, заснаваная на светапогляднай і сюжэтна-вобразнай сістэме міфа, як разнавіднасць інтэртэкстуальнасці. Мэта дадзенага артыкула – разгляд тыпаў мастацкага міфалагізму і асаблівасцей функцыянавання міфалагічных элементаў у структуры мастацкіх твораў сучаснай беларускай паэзіі. Адзначым, што, нягледзячы на прысутнасць у беларускім літаратуразнаўстве грунтоўных прац, манаграфій, асобных артыкулаў па праблеме сувязі міфа і літаратуры Беларусі (В. Каваленка, І. Навуменка, У. Калеснік, Т. Шамякіна, Г. Друк, А. Васілевіч і інш.), асаблівасці мастацкага міфалагізму менавіта ў

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

беларускай паэзіі апошніх дваццаці гадоў застаюцца пакуль недастаткова вывучанымі, гэтаму пытанню прысвечаны толькі асобныя артыкулы Г. Кісліцынай, П. Васючэнкі, У. Верынай, І. Шауляковай і інш.

У канцы XX – пачатку XXI ст. беларуская літаратура дае ў асноўным прыклады знешняга (не значыць непаўнавартаснага) міфалагізму. Гэта натуральныя спробы стварыць гістарычную міфалогію незалежнай еўрапейскай дзяржавы Беларусь, міфалагізаваць гістарычных асобаў, дзеячаў культуры і мастацтва, літаратурных папярэднікаў. Да прычын міфалагізацыі ў гэты час можна аднесці грамадска-палітычныя, звязаныя са стварэннем самастойнай дзяржавы і яе новай міфалогіі. Не апошняе месца займаюць і агульначалавечыя прычыны, такія, як неабходнасць вярнуць страчанае адчуванне еднасці чалавека і Сусвету. Варта таксама адзначыць уплыў постмадэрнісцкай філасофіі, мода на якую дайшла да літаратуры Беларусі пасля адкрыцця "жалезнай заслоны". У беларускай паэзіі апошніх дзесяцігоддзяў да міфалагізацыі звярталіся такія паэты, як А. Разанаў, Н. Артымовіч, Я. Сіпакоў, У. Арлоў, В. Аксак, А. Сыс, В. Шніп, Т. Сапач, Г. Булыка, І. Сідарук, І. Бабкоў, Л. Сільнова, Л. Сом, І. Дарафейчук, М. Баярын і інш. Адзначым, што дадзены артыкул не прэтэндуе на цэласны ахоп сучаснай паэзіі, мы спынімся на творах асобных аўтараў, для якіх, на наш погляд, міфалагізм стаў адным з вызначальных элементаў паэтыкі. Паспрабуем акрэсліць асноўныя тыпы мастацкага міфалагізму ў сучаснай паэзіі, звярнуўшыся да творчасці А. Сыса, У. Арлова, В. Шніпа.

**Арганічны міфалагізм.** Творчасць А. Сыса з'яўляецца адным з нешматлікіх прыкладаў арганічнага міфалагізму ў сучаснай паэзіі. А. Сыс не гуляецца з вечнымі вобразамі, не займаецца рэканструкцыяй міфалагічных сюжэтаў, не "засейвае" вершы імёнамі міфалагічных герояў, багоў, істот, як гэта робяць шматлікія паэты яго пакалення. У той жа час з твораў паэта струменіць энергія міфапаэтычнага светабачання, якое праяўляе сябе праз тропіку, падтэкст, сімвалы. А. Сыс не баіцца быць пафасным, не спрабуе здавацца па-моднаму іранічным, а намагаецца пісаць як мага больш шчыра. Для яго твораў характэрны зварот да ўзнаўлення глыбінных структур мыслення. Размытасць прасторы і часу не іграе ў паэзіі А. Сыса значнай ролі, а вось пераўтварэнні, метамарфозы – гэта сустракаецца ў вершах вельмі часта ("Сабака", "Вужака", "Балада пра птаха", "Спаўзаючы з церня"). Паэт выкарыстоўвае і этнічна самабытныя пласты, дзе яшчэ жывыя элементы міфалагічнага мыслення, пераважна праз зварот да замовы, як адной з праяў міфалагічнага мыслення ("Неапалімая купіна", "Чорная гадзюка, белая змяя", "Алаіза").

Аднаўленне міфалагічных матываў – важны элемент у мастацкай міфатворчасці А. Сыса. Так, матыў ахвярнасці ўзнікае ў шматлікіх вершах паэта. Усведамленне творчасці як ахвяры рэалізуецца праз метафару крыві. Як заўважае І. Штэйнер, пасля Купалы ні ў аднаго беларускага паэта няма столькі крыві ў вершах. Зразумела, паэты не перасталі адчуваць трагічнасць існавання, "паэтыка надрыву", трагічны пафас не зніклі з твораў, аднак вобразная структура верша змянілася, у размове пра смерць, пакуты і ахвярнасць сталі выкарыстоўвацца менш "натуралістычныя" вобразы. А. Сыс у гэтым плане выключэнне. Яго паэзія "крывавіць", яна ўсведамляецца паэтам як плаха, якую ён абраў сам: *"Спяшай, пакуль твой кат на пласе // пляце ўдаўку з васількоў. // Паэзія цябе не адракла-ся. // Ёсць час. // Гарлянкай з ёю хлыне твая кроў..."* [Тут і далей у цытатах захоўваецца аўтарская арфаграфія. – А.Ш.] ("Цнатлівы князь") [5, с. 135].

Жыццё і час у паэта вымяраецца не днямі, а вершамі: *"бо засталося дзевяць вершаў мне пражыць"* [Тамсама, с. 140]. Мова атаясамліваецца з ранай ("Маналог Кастуся Каганца"), а творчасць параўноўваецца з цяжкай хваробай, калі паэтам *"дыхаецца цяжэй, чым каму"* [Тамсама, с. 56], калі хрыпяць грудзі і *"душацца крывавым кашлем <...> бо ў гэтай крыві крыецца іх хвароба, бо ў*

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова

*гэтай крыві выратаванне іх народа"* ("Пошасныя") [Тамсама, с. 56]. Тут варта бачыць не толькі ўсведамленне А. Сысам таленту як хваробы, але і намёк на трагічны лёс паэтаў, што памерлі ад сухотаў. Трэба адзначыць, што да вобразаў паэтаў-сухотнікаў часта звярталіся іх літаратурныя наступнікі, тым самым міфалагізуючы рэальных асобаў. Такая паэтычная міфалагізацыя звязана з імёнамі Цёткі, А. Гаруна, М. Багдановіча, С. Палуяна (пасля заўчаснай смерці А. Сыса пачалося стварэнне міфа і вакол яго ўласнай асобы). *"Кроў маю // мой народ ацэніць"* [Тамсама, с. 112], – піша паэт у паэме "Алаіза", прысвечанай трагічнаму лёсу А. Пашкевіч. З вершаў А. Сыса паўстае вобраз творцы, які быццам не на паперы піша, а ўдзельнічае ў абрадзе ахвярапрынашэння, дзе крывавы характар ахвяры падкрэслівае яе найвышэйшы статус. Прычым застаецца ўражанне, што для паэта гэта не дэкаратыўны прыём, сродак мастацкага аздаблення, а непадробнае светаадчуванне. Узгадаем, што кроў – гэта універсальны сімвал жыцця, увасабленне жыццёвай энергіі. Міфалагічнае ўяўленне лічыла кроў субстанцыяй, у якой утрымліваецца душа, боскі элемент жыцця. На гэтым атаясамленні заснаваныя шматлікія рытуалы. Напрыклад, у старажытныя часы "руны магічна ажыўляліся чырвонай фарбай, каб узмацніць адчуванне, што яны быццам бы запаўняліся крывёй" [4, с. 426]. Захаваліся таксама старажытнакітайскія паданні пра тое, што "намаляваныя драконы ўзляталі пасля таго, як ім крывёй падмалёўвалі вочы" [4, с. 427]. У паэзіі А. Сыса лірычны герой таксама падсвядома адчувае, што магія слова дзейнічае толькі тады, калі ёй аддаеш сваю жыццёвую сілу, энергію, "кроў": *"...і тагды я складаў малітву, // можа ў соты свой самасуд, // той малітвай, нібыта брытвай, сашкрабаў у адчаі бруд, у адчаі я рэзаў вочы, і жахаўся крыві сваёй..."* ("Перад богам") [5, с. 118].

Можна сказаць, што метафара крыві адносіцца да найбольш знакавых у творчасці А. Сыса, праз кроў прэзентуецца творчасць як ахвярнае служэнне сваёй бацькаўшчыне, людзям, роднай мове. Аддаваць кроў – гэта значыць аддаваць сябе, сваё жыццё, фізічныя і душэўныя сілы на алтар паэзіі.

**Знешні міфалагізм.** Гэты тып міфалагізму характэрны для твораў А. Разанава, У. Арлова, І. Бабкова, М. Баярына і інш. Так, у творах У. Арлова можна заўважыць аднаўленне глыбінных структур міфалагічнага мыслення праз сумяшчэнне розных часоў, метамарфозы персанажаў ("Сустрэчныя", "Архіварыус Война"); інтэрпрэтацыю міфалагічных сюжэтаў і вобразаў, часам іранічную (лабірынт у творы "Спроба завершанага жыццяпісу"); міфалагізацыю гістарычных асобаў ("Ян Баршчэўскі") і інш.

Лірычны герой У. Арлова – гэта вандроўнік. Яго вочы глядзяць на экзатычныя краявіды праз кнігі, прачытаныя аб гэтых краінах, нібы праз трафарэт: *"...Па галерэях Крайстчорч-каледжу, // палохаючы японскіх турыстаў, // бадзяецца дух // Льюіса Кэрала. // У засьнежаных лугах // мільганецца духам Алісы // вохрыстая лісіца. // Лёндан // вынырне з завірухі // мокрай няўтульнасцю // дыкензаўскіх паралелепіпедаў"* ("Оксфард") [2, с. 80]. Усе падарожжы лірычнага героя нязменна завяршаюцца высновай: *"Я не тая расліна, што прыжывецца на гэтай глебе"* ("Экспэдыцыя ў Сахару") [2, с. 112]. Герой У. Арлова ўвасабляе міфалагічны "адысееўскі" тып вандроўніка, які падарожнічае, каб вярнуцца на радзіму: *"...і расцягнуцца на цёплым пяску, // павярнуўшыся тварам // да краіны, // у паломніцтва да якой ператвараецца тваё кожнае падарожжа..."* ("Экспэдыцыя ў Сахару") [Тамсама, с. 112-113]. Лірычны герой, быццам герой казак, выпраўляецца ў падарожжа-ініцыяцыю, каб спазнаць самога сябе і сваё месца ў Сусвеце праз пазнанне чужога, незнаёмага свету. На радзіме яго чакае жанчына, прычым закаханыя заўсёды раз'яднаныя, вымушаныя пераадольваць перашкоды, каб сустрэцца, а сродкам сувязі становіцца ўяўленне, сон, а таксама тэлефон – адушаўлёны і міфалагізаваны прадмет у літаратуры XX ст., які з'яўляецца ста-

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імені А. А. Куляшова

лым сімвалам разлукі: *"Аднойчы прачнецца тэлефон, // што гаварыў некалі тваім голасам..."* ("Мансарда") [Тамсама, с. 20]. Трэба адзначыць, што тэма кахання ў творах У. Арлова мае выразную эратычную афарбоўку. Эратызацыя, цялеснасць – характэрныя рысы паэтыкі мастацкіх твораў У. Арлова ("Парыжанка з Кносу", "Бэрлінская фантазія" "Абдымаючы цябе", "Сачу твае знакі, Свабода" і інш.). Як заўважае І. Ільін, эратызацыя мастацкай літаратуры – непазбежны вынік агульнага ірацыянальнага духа постструктуралісцкага мыслення.

Ірацыянальнасць светаадчування праяўляецца і праз такую рысу паэтыкі, як часты зварот да кантрасту, калі побач ужываюцца мастацкія вобразы з рознай стылістычнай афарбоўкай, спалучаецца высокае і нізкае, узнёслае і побытавае, а часам нават брутальнае, натуралістычнае ("Парыжанка з Кносу, "Божая кароўка з пятай авеню" "Фаўна сноў" і інш.). Пры гэтым адчуваецца раўнапраўнасць такіх вобразаў для свядомасці наратара: *"Канцлер Вялікага Княства Літоўскага // Леў Сапега, // што заклапочана зашпільвае сіні жупан, // выходзячы з XVI стагодзьдзя // праз маю прыбіральню..."* ("Фаўна сноў") [Тамсама, с. 36].

Аўтар любіць прыдумляць сваім персанажам міфалагічныя біяграфіі. Так, ён уяўляе, што божая кароўка была ў мінулым жыцці паслушкай Свята-Ефрасіннеўскага манастыра або першакласніцай з Серабранкі ("Божая кароўка з пятай авеню"). У творы "Парыжанка з Кносу" жанчына, якая едзе ў мінскім трамваі, мае іншы жыццяпіс, паводле якога яна жыла ў часы цара Мінаса і была каханкай Дэдала: *"Усё гэта да позеху трывіяльна, // але // ў тваіх антрацытавых вачах // люструецца іншы жыцьцяпіс, // дзе кожны сюжэт // слухае ўтрапёных цыкадаў, // душна пахнучы лявандаю"* [2, с. 9].

Такім чынам, знешні тып мастацкага міфалагізму ў творчасці У. Арлова рэалізуецца праз асучасніванне міфалагічных матываў (падарожжа), зварот да міфалагем новага часу (тэлефон) а таксама праз узнаўленне глыбінных структур мыслення (сумяшчэнне розных прастора-часавых пластоў, пераўтварэнне персанажаў, раўнапраўнасць розных карцін свету).

**Сінтэтычны міфалагізм.** У творах В. Шніпа прысутнічае як арганічны, так і знешні тып міфалагізму. Арганічны тып найперш праяўляецца праз падтэкст, тропіку, звязаную з універсальнымі канстантамі чалавечага быцця (стыхіі). У апошніх зборніках паэта ("Беларускае мора", "Балада камянёў") значнае месца займае тропіка, звязаная са стыхіяй вады. Параўнанне воднай плыні з чалавечым жыццём, якое часта сустракаецца ў паэзіі В. Шніпа, вельмі старажытнае. Чалавек з пракаветных часоў праводзіў паралель паміж кароткім і зменлівым жыццём з бегам вады, якая ніводнай хвіліны не стаіць на месцы. Прыгадаем хаця б вядомае выслоўе антычнага філосафа Геракліта, які казаў, што ўсё цячэ, усё змяняецца, і нельга два разы ўвайсці ў адну і тую ж раку.

В. Шніп міфалагізуе рэчаіснасць праз далучэнне да звычайных падзей жыцця біблейскай вобразнасці (якая мае міфалагічныя карані), ён праводзіць паралелі паміж дажджом і божай карай, патопам. Жыццё – гэта патоп, праз які плыве лірычны герой, дом якога змывае вадой: *"І бачылі людзі, як дом твой сплываў // У свет, як каўчэг, паміж дрэў, нібы траў..."* ("Балада красавіка") [6, с. 92]. Так узнікае тэма бяздом'я, непрытульнасці, неўладкаванасці і адчування дысгармоніі ў жыцці. Дні – гэта лісты, што незваротна сплываюць у "патопе жыцця": *"Адыходзіць нядзеля, як Ноеў каўчэг // адплывае, і перад патопнай вадою // Ён, як ліст, // на якім наш запісаны грэх..."* ("Балада нядзелі") [Тамсама, с. 88]. Стыхія вады мае розныя значэнні ў розных творах паэта (абставіны жыцця, драматычныя падзеі і інш.), аднак яна заўсёды мацнейшая за лірычнага героя, які вымушаны плысці ўслед за вадой па жыцці, не маючы сілы змяніць ход падзей. Светаадчуванне лірычнага героя глыбока песімістычнае, прычынай чаму ўсведамленне трагічнага несупадзення

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

паміж светам мары і рэальнасці, таму навакольны свет усведамляецца як чужы, а жыццё падсвечваецца непазбежнай смерцю: *"І я гляджу з вакна, як з дамавіны, // Якая ціха праз патоп плыве"* ("Я не прывыкну да дажджоў ніколі") [Тамсама, с. 218]. Эсхаталагічныя матывы таксама прэзентуюцца праз прызму стыхій, калі сонца патухне, цемра наплыве, свет патоне: *"...І сонца патухне, як свечка ў царкве, // І цемра, як дым, у наш свет наплыве, // і свет наш патоне, як камень цяжкі / / У чорнае плыні чарнюткай ракі..."* ("Балада сонца") [Тамсама, с. 52].

Знешні тып міфалагізму праяўляецца праз засваенне міфалогіі як культурнага пласта і паўстае ў творах паэта праз параўнанні тых ці іншых з'яў ці прадметаў з міфалагічнымі персанажамі, істотамі. Так, з цмокам параўноўваецца дым ("Дым"), печ ("Комін"). Палонка на рацэ нагадвае паэту вока цмока, які прачнуўся сярод зімы ("Палонка"). Хмара атаясамліваецца з птахам, што нясе наш свет у кіпцюрах ("Балада вераснёвай ночы"). Звяртаецца паэт і да персанажаў з літаратурных казак, якія функцыянуюць у культуры як прэцэдэнтныя тэксты. Так, у нары жыве крот, які марыць ажаніцца з Дзюймовачкай ("Нара"), а *"снег гэта сон // які сніцца Снягурцы // што ўзляцела над вогнішчам // і знікла ў небе // з якога пасыпаўся снег // як попел"* ("Снег") [Тамсама, с. 289]. Сажалка пад лёдам атаясамліваецца з вялікім люстэркам у палацы зімы, дзе жыве Снежная каралева ("Лёд") [Тамсама, с. 307].

Трэба адзначыць, што засваенне паэтам міфалагічнага пласта найбольш ярка праяўляе сябе ў апошніх двух зборніках, асабліва ў раздзеле "Белае і чорнае" кнігі "Балада камянёў" (2006). Гэты цыкл твораў нагадвае вершаказы А. Разанава і арыентаваны на прытчавасць, лірыка-філасофскую медытацыю, універсальныя канстанты быцця, пра што гавораць самі назвы твораў ("Хата", "Смерць", "Пыл", "Ноч" і інш.). Але істотную ролю ў творах В. Шніпа адыгрывае і такі тып міфалагізму, як аднаўленне фальклорных і этнічна самабытных пластоў нацыянальнай свядомасці, дзе яшчэ жывыя элементы міфалагічнага светабачання ("Калодзеж", "Дрэва", "Парог" і інш.).

Такім чынам, міфалагізм у творах В. Шніпа адносіцца да сінтэтычнага тыпу, рэалізуецца праз зварот да універсальных канстант чалавечага быцця; далучэнне міфалагічных вобразаў да звычайных падзей жыцця; параўнанне пэўных з'яў і прадметаў з міфалагічнымі персанажамі, а таксама з персанажамі літаратурных казак; аднаўленне элементаў міфалагічнага мыслення, што яшчэ захаваліся ў народнай свядомасці.

Падагульняючы, адзначым, што праз аналіз спосабаў міфалагізацыі ў мастацкім творы мы разгледзелі тры тыпы паэтычнага светаадчування, тры тыпы вобразнай канцэпцыі асобы лірычнага героя (тэрмін А. Андрэева) у творчасці сучасных паэтаў. На падставе аналізу мы можам сцвярджаць, што ў сучаснай беларускай паэзіі прысутнічаюць арганічны, знешні і сінтэтычны тыпы міфалагізму. Мы прааналізавалі толькі асноўныя асаблівасці выкарыстання міфа сучаснай беларускай паэзіяй. Адзначым, што асобнага даследавання патрабуюць такія істотныя рысы міфалагізацыі ў беларускай літаратуры, як, напрыклад, міфалагізацыя нацыянальнай гісторыі, рэальных асоб, стварэнне аўтарскіх міфаў і інш.

*ЛІТАРАТУРА*


1. ***Андреев, А.Н.*** Целостный анализ литературного произведения / А.Н. Андрееев. – Минск: БГУ, 2003. – 146 с.
2. ***Арлоў, У.А.*** Паром праз Ля-Манш / У.А. Арлоў. – Мінск: Логвінаў, 2006. – 156 с.
3. ***Ильин, И.П.*** Постмодернизм. Словарь терминов / И.П. Ильин. – М.: Интрада, 2001. – 384 с.
4. ***Истомина, Н.А.*** Энциклопедический словарь символов / Н.А. Истомина. – М.: АСТ. Астрель, 2003. – 1056 с.
5. ***Сыс, А.Ц.*** Сыс: Вершы / А.Ц. Сыс. – Мінск: Маст. літ., 2002. – 159 с.
6. ***Шніп, В.А.*** Балада камянёў / В.А. Шніп. – Мінск: Маст. літ., 2006. – 318 с.


Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

7. ***Штэйнер, І.*** Маналог Анатоля Сыса / І. Штэйнер // Дзеяслоў. – 2006. – № 2. – С. 199-217.
8. ***Эпштейн, М.Н.*** Мифологизм в литературе XX в. / М.Н. Эпштейн // Лит. энцикл. словарь / под общ. ред. В.М. Кожевникова, П.А. Николаева – М.: Сов. энциклопедия, 1987. – С. 224-225.

Паступіў у рэдакцыю 25.09.2006 г.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова